Жыві і цэльнасці шукай, аб шыраце духоўнай дбай...
М. Багдановіч

# ALMA PAPERA

Студэнцкая газета БДУ культуры і мастацтваў

№№ 3 - 4 (23 - 24) красавік - май 2008 Выдаецца з сакавіка 2005

## МЫ ЯШЧЭ ВЕРНЕМСЯ

Апошні нумар... І сапраўды, рэдакцыя газеты ў старым складзе ў апошні раз для вас, шаноўныя чытачы, рыхтуе гэтае выданне газеты. Стварылі мы яе тры гады таму на другім курсе, а зараз настаў час, калі заканчваем Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, пакідаем навучальную ўстанову, ідзем працаваць на іншыя пасады і як вынік таксама пакідаем газету... нашу "Alma-paperу". Не хвалюйцеся, мы пакідаем на сваім месцы цікавых людзей, якія й надалей будуць рабіць і ствараць газету... Магчыма, яна будзе крышачку іншай – гэта будзе творчая дзейнасць іншых людзей, але й яна абавязкова будзе... Можа нават цікавейшай, больш яркай і патрэбнай...

У першым нумары на першай старонцы мы змясцілі прывітанне ад рэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Ядвігі Грыгаровіч. Вельмі сімвалічна тое, што фотаздымак Ядвігі Дамінікаўны таксама і на першай старонцы "нашай" апошняй газеты. Нагода крышачку іншая – калі тры гады таму рэктар вітала стварэнне новага выдання ва універсітэце, дык зараз мы вітаем і віншуем нашага рэктара з прысваеннем звання "Ганаровага рэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацваў". Дарэчы, Ядвіга Дамінікаўна заўсёды падтрымлівала пачынанні маладых ды нявопатных журналістаў. Таму нам ёсць за што сказаць ёй "Вялікі дзякуй!!!".

Далей пра журналістыку. Абсалютна кожны чалавек, чые словы з'яўляліся ды будуць з'яўляцца на старонках студэнцкага выдання – журналіст. Мы выконваем сваю галоўную функцыю – функцыю камунікацыі паміж людзьмі, паміж уладамі. Мы ствараем для вас, спадзяемся, цікавую газету. А што яшчэ для журналіста трэба – толькі магчымасць працаваць ды размаўляць праз газетны радок, альбо хвалі эфіру з вамі, шаноўныя чытачы ды слухачы.

Спадзяемся, што кожны чалавек і надалей будзе выконваць гэтую простую і адвечную функцыю. Такім чынам, мы яшчэ сустрэнемся з вамі...

РЭДАКЦЫЯ



## АНОНС НУМАРА

*Студэнцкае веча*

*Хочаш - вер, хочаш - не вер!..*

*Гісторыя аднаго фотаздымка*

*АСОБА*

*Альфабэт. Працяг*

*Арт-мажор*

*Спроба пяра*